УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ МАГІЛЁЎСКАГА ГАРВЫКАНКАМА

МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ХАРЧАВАННЯ

# ГІСТОРЫЯ МАГІЛЁВА: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ

зборнік навуковых прац
удзельнікаў Трэццяй Міжнароднай
навуковай канферэнцыі
"Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць"

**22-23 мая 2003 г.**

ЧАСТКА І

Магілёў
2003

УДК 947.64-25
ББК 63.3 (2 Б)

**Навуковыя рэцэнзенты:**
доктар гістарычных навук, прафесар ***Рыер Я.Р.***
доктар сацыялагічных навук, прафесар ***Бубнаў Ю.М.***

**Укладальнікі**
***Пушкін І.А., Юдзін В.В.***

**Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць:** зборнік навуковых прац удзельнікаў Трэццяй Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць» у 2 ч. Ч.І / Уклад. І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. – Магілёў, 2003. – 300 с.

У зборнік "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" увайшлі навуковыя працы удзельнікаў Трэццяй міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць», якая адбылася ў г. Магілёве 22 – 23 мая 2003 года. У канферэнцыі бралі ўдзел навукоўцы з Беларусі, Ізраіля, Польшчы, Расіі, Украіны, ЗША. У зборніку захаваныя погляды, арфаграфія і мова аўтараў, таму за магчымыя недакладнасці і спрэчныя моманты ў тэксце адказнасць нясуць аўтары.

**УДК 947.64-25**
**ББК 63.3 (2 Б)**

*На вокладцы: прамалёўка кляйма - княскага знаку князя Усяслава Ізяслававіча з керамічнага вырабу знойдзенага ў гістарычнай частцы горада Магілёва.*

© Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт
© Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання

**А. Ефімовіч**

# ПРАВЯДЗЕННЕ КОНТРРЭФОРМЫ Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ ВЁСЦЫ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1857 – 1862 гг.

У 1830 – 1850-х гадах у заходніх губернях Расійскай імперыі была праведзена рэформа дзяржаўнай вёсцы. Аўтарам і распрацоўшчыкам яе быў граф П. Дз. Кісялёў, які з"яўляўся тады Міністрам дзяржаўных маёмасцей. Асноўнай часткай рэформы была люстрацыя казённых маёнткаў.

К 1857 г. люстрацыя была закончана ва ўсіх маёнтках за выключэннем тых, якія былі прыняты ад прыходскага духавенства. Аднак рэформа ў адносінах да гаспадарчага ўпарадкавання маёнткаў не пынесла чаканай карысці [3, с. 257]. Таксама рэформа П. Дз. Кісялёва выклікала супрацьдзеянне памешчыцкага класа, які ўбачыў у гэтым замах на свае саслоўныя прэрэгатывы. Такія папрокі мелі пад сабой рэальныя падставы. Нягледзячы на значнае зніжэнне павіннаснага прыгнёту, заставалася вострай праблема малазямелля [8, с. 203].

Усё гэта патрабавала правядзення паверачнай люстрацыі. Падрыхтоўка гэтай работы пачалася ў 1853 г. П. Дз. Кісялёў спадзяваўся ў ходзе паверкі ліквідаваць усе адмоўныя бакі рэформы. Асобае значэнне ён прыдаваў павышэнню дахода з дзяржаўных маёнткаў [7, с. 208].

У пачатку 1857 г. замест П. Дз. Кісялёва Міністэрства дзяржаўных маёмасцей узначаліў М. М. Мураўёў. Ён праводзіў зусім іншую, чым яго папярэднік, палітыку. Зацікаўлены ў выяўленні адмоўных бакоў рэформы П. Дз. Кісялёва, М. М. Мураўёў назначыў новую рэвізію дзяржаўных маёмасцей у 9 Заходніх губернях. У іх склад увайшла і Магілёўская, яе рэвізаваў стацкі савєтнік Кейстут-Гедэмін [7, с. 209 – 210].

Прыступіўшы ў 1858 г. да напісання новых правіл для паверачнай люстрацыі, Міністэрства прапанавала:

1)Увесці ў размеркаванне зямель такія паляпшэнні, якія б садзейнічалі поспехам сялянскай гаспадаркі, разам з тым забяспечвалі б казну даходамі.

2)Дасягнуць магчыма дакладнага вылічэння дахода.

3)Даць састаўным часткам маёнткаў такое ўпарадкаванне, якое б аблягчала кіраванне і, у той жа час, садзейнічала паступоваму развіццю ўсіх відаў народнай сельскай прамысловасці [3, с. 258].

У адносінах да размеркавання зямлі галоўным недахопам люстрацыйнага размеркавання было раз"яднанне свабодных, запасных і вакантных зямель цераспалоснымі ўгоддзьмі, якія даваліся сялянам, пабочным абывацелям, прыходскаму духавенству і іншым. Так, пры трохпольным севазвароце сялянам адводзілі землі ў трох зменах, пры гэтым кожнаму гаспадару наразалі асобы пай у кожнай змене. Але калі землі, якія ўваходзілі ў склад адной змены, мелі розную каштоўнасць, то кожны надзел вызначанай якасці падзяляўся па

колькасці гаспадароў яшчэ на некалькі надзелаў. У выніку гэтага ўзнікла крайняя цераспалоснасіца з усімі недахопамі [2, с. 134 – 135].

Але, калі паглядзець на лічбы прадстаўленыя ў табліцы №1, то бачна, што ў Магілёўскай губерні працэнт цераспалосіцы адносна невялікі. Калі браць па паветах, то можна сказаць, што ў большасці паветаў (у 7) працэнт цераспалосных уладанняў не перавышае нават 10 %, у 2-х паветах цераспалосныя землі наогул адсутнічаюць, але ў 4-х паветах працэнт цераспалосных уладанняў перавышае 10 %, а ў Чэрыкаўскім павеце ён нават складае 76,64 %. Увогуле па губерні гэтая лічба складае 10,69 % ад агульнай плошчы казённых маёнткаў [5, л. 125 – 127].

З мэтай паляпшэння люстрацыйнага падзелу зямлі былі прыняты наступныя меры.

З лішніх запасных, вакантных і наогул свабодных надзелаў, размешчаных неўдобна для супольнай гаспадаркі, прапанавана было ўтварыць, метадам абмену іх, наколькі гэта было магчыма, на землі адведзеныя сялянам, ляснічым, лясной ахове і сельскаму духавеиству,– суцэльныя ўладанні, якія б аб"ядналі ў сабе ўсё патрэбнае для самастойнай фермерскай гаспадаркі [2, с. 135].

У адносінах да вылічэння пазямельнага аброку папярэдняя люстрацыя заціснула ацэначную сістэму ў цесныя рамкі нармальных пасеваў, нармальных ураджаеў і нармальных цэн на сельскагаспадарчыя прадукты [2, с. 136]. Так як ацэнка аброку можа залежаць яшчэ і ад іншых аб"ектыўных прычын, такіх, як надвор"е, цэны на сельскагаспадарчыя прадукты ў гэтым годзе і гэтак далей, то не ўсе сяляне маглі справіцца з аброкам. А аброк у параўнанні з іншымі падаткамі выглядаў дастаткова вялікім. Так, пазямельны аброк на дзесяціну складаў 74 і ¼ капейкі. На 1 рэвізскую душу мужчынскага полу прыходзіцца падушнага падатку 97 і ¾ капейкі, з якіх нядоімка складае 4 і ½ капейкі; аброк – 92 і ¾ капейкі, нядоімка – 38 і ¾ капейкі; збор за лес – 11 і ¼ капейкі. У цэлым па губерні нядоімкі падушнай і аброчнага падатку складалі прыкладна 18,03% ад агульнага аклада, а нядоімак са збору за лес не было наогул [5, л. 137, 140].

Для выпраўлення ацэнкі, міністэрства прызнала патрэбным увесці ў ацэначную сістэму такія асновы, якія б набліжалі аброчную плату да ступені даходнасці зямлі ў вызначаны момант, разам з тым, вызначалі б пастаянныя асновы будучым ацэнкам без папярэдніх паверачных работ. З гэтай мэтаю для паверачнай ацэнкі зямель па інструкцыі 1858 г. прыняты былі наступныя правілы.

Пастаянны пазямельны даход вызначаўся вагой хлеба, прымаючы фунт жыта за адзінку вылічэння. Прынята было лічыць, што адна чвэрць жыта важыць 320 фунтаў і гэта кошт пуда лугавога сена сярэдняй якасці раўняецца па кошту 6 фунтам жыта; а кошт пуда балотнага на 1/3 меней, г. зн. 4 фунты. Па розніцы кармавых траў на лугавых сенакосах і па адносінах іх якасці да сена, сабранага на лясных лугах, апошняе было прынята за сена сярэдняй якасці; кошт аднаго пуда мурожнага сена вызначаны ў 10, а паемнага ў 8 фунтаў жыта, так як першае ацэньвалася на 2/3, а другое на 1/3 вышэй ляснога сена. Трэць вылічанага такім чынам дахода, вызначала аброчны падатак.

Табліца 1. **Колькасць зямлі ў сялян у 1858 г.**

| Назвы акругоў і паветаў | Усяго казённай зямлі | У тым ліку | | |
|---|---|---|---|---|
| | | У адзіным уладанні | У цераспалосным уладанні | |
| | дзесяцін | | | % |
| Быхаўская акруга: | | | | |
| -Быхаўскі павет | 51 305 | 49 545 | 1 760 | 3,43 |
| -Чэрыкаўскі павет | 20 311 | 4 743 | 15 568 | 76,64 |
| -Рагачоўскі павет | 60 452 | 54 980 | 5 472 | 9,05 |
| -Гомельскі павет | 16 896 | 16 896 | — | 0 |
| Мсціслаўская акруга: | | | | |
| -Мсціслаўскі павет | 29 355 | 19 826 | 9 529 | 32,46 |
| -Клімавіцкі павет | 4 224 | 3673 | 551 | 13,04 |
| -Чаўшскі павет | 49 046 | 46 988 | 2 058 | 4,19 |
| Аршанская акруга: | | | | |
| -Аршанскі павет | 63 627 | 63 180 | 447 | 0,7 |
| -Копыльскі павет | 18 185 | 18 185 | — | 0 |
| -Сенніцкі павет | 28 659 | 27 690 | 969 | 3,38 |
| -Магілёўскі павет | 29 210 | 25874 | 3 336 | 11,42 |
| Ітага | 371 270 | 331 580 | 39 690 | 10,69 |

Колькасць фунтаў жыта, вылічанная на гэтай аснове, вызначае пастаянны пазямельны даход, які пералічваўся на грошы па кошту фунта жыта, які выводзіўся з сярэдніх уездных цэн за апошнія 12 год, выключаючы два гады, калі цэны былі вышэй іншых, і з паніжэннем сярэдней цаны астатніх дзесяці год на 10 %.

Такім чынам павінна была быць дасягнута магчымасць выводзіць канчатковую пазямельную ацэнку без новага падрабязнага перавылічэння [3, с. 138 – 140].

У адносінах да ўпарадкавання састаўных частак маёнткаў галоўным недахопам было тое, што ў арэнду здаваліся асобныя аброчныя станцыі. Гэта пазбаўляла казну магчымасці атрымліваць з маёнткаў патрэбны даход [2, с. 140].

Так, калі паглядзець на параўнальныя лічбы па Магілёўскай губерні, то можна пабачыць наступнае. Плошча маёнткаў і ферм ў дзесяцінах складала 1 654,15; а сенакосаў, вакантных і запасных зямель – 3 203,05 (што амаль удвая больш за першыя). Арэндны і аброчны даход з маёнткаў і ферм складаў 286,98 рублёў, а з асобных станцей – 1093,41 рубля. Такім чынам, атрымлівалася, што аброк з асобных станцей больш амаль у 5 разоў, чым з маёнткаў і ферм. Але і

нядоімкі з асобных стацый былі вельмі вялікія: з маёнткаў і ферм – 158,13 ? рубля, а з сенакосаў, вакантных і запасных зямель – 989,13 ?. У выніку, калі падлічыць рэальны даход з агульных плошчаў і асобных стацый, то атрымліваецца, што з меншых плошчаў агульных маёнткаў і ферм у казну паступала больш грошай, чым з большых плошчаў вакантных, запасных і сенакосных зямель [6, л. 247 – 248, 276 – 277].

Галоўнай задачай у гэтым накірунку было стварэнне арэндных ферм метадам далучэння ўсіх аброчных стацый да асноўных маёнткаў, ці метадам абмену цераспалосных участкаў. Таксама прапанавалася забраць з сялянскага карыстання лясныя ўчасткі плошчай да 5 дзесяцін пад выглядам адстойвання інтарэсаў лесаводства. Гэтая мера наносіла ўдар па інтарэсах сялянскай гаспадаркі, так як адразаемыя землі не кампенсаваліся папаўненнем надзелаў у другіх месцах [7, с. 216].

З гэтымі мэтамі была пачата ў 1858 г. паверачная люстрацыя ў Магілёўскай губерні, якая была завершана ў лістападзе таго ж года, як аб гэтым паведаміў у Міністэрства дзяржаўных маёмасцей стацкі саветнік Кейстут-Гедымін [6, л. 21]. Ім жа былі зроблены асноўныя вынікі, што грамадскія ворывы апрацоўваюцца, як дадатковыя і не ўгнойваюцца, а без угнаення даюць дрэнныя ўраджаі. З мэтай паляпшэння сітуацыі Кейстут-Гедымін прапанаваў аддаць гэтыя ворывы аднаму гаспадару разам з запаснымі часткамі на таргах, г. зн. у арэнду [4, л. 18].

Албыўшыеся ў выніку гэтага змены ў складзе даходнасці каённых маёнткаў падрабязна апісаны ў табліцы №2.

Табліца 2 **Вынікі паверачных работ па Магілёўскай губерні**

| | Сялян рэвізскіх душ мужскога полу | Землі прыдатнай, ацэненай на даход з маёнткаў | | | Даход | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Для сялян | Аброчных ферм | У іх зямлі | Пазямельнага аброку з сялян | Ад зямель фермерскіх | Сярэдняя лічба з дзесяціны |
| | | дзесяцін | | | рублёў | | |
| Па люстрацыі | 31 652 | 131 554 | - | - | 80 422,51 | - | 0,61 |
| Па паверцы | 31 787 | 143 278 | 85 | 9 255 | 104 424,73 | 6 902 | 0,73 |

300 агароднікам і бабылям адведзены часткова поўныя, а часткова палавінныя надзелы, у выніку чаго агульны надзел сялян угодзямі павялічыўся прыкладна на 8 %.

Пасля далучэння значнай часткі запасных і вакантных надзелаў, зарослых лесам, да лясных дач у агульную плошчу, утворана:

ферм 85
у іх зямлі прыдатнай 9255 дзесяцін
сярэдняй колькасцю на кожную 109 дзесяцін

Выведзены спачатку больш рацыянальны пазямельны даход з маёнткаў павялічыўся супраць дахода, назначанага люстрацыяй у Магілёўскай губерні на 24002,22 рубля, што з"яўцляецца самай малой лічбай у параўнанні з іншымі беларускімі губернямі. Наогул, лічбы паказваюць, што даходы ў казну першапачаткова павялічыліся.

Адным з галоўных вынікаў аграрных мерапрыемстваў паверачнай люстрацыі было стварэнне арэндных ферм. У Магілёўскай губерні, як бачна з табліцы № 2, іх было створана 85.

У склад ферм увайшлі былыя фальваркі, створаныя сялянамі на запасной зямлі, хутарскія гаспадаркі і адрэзкі ад надзельных зямель, уключаючы і некаторую частку сядзіб з усімі гаспадарчымі ўтварэннямі.

Урад спадзяваўся атрымаць ад ферм значны эканамічны эфект. З гэтай мэтай у 1859 г. былі выдадзены новыя правілы па аддачы зямлі ў арэнду. Сутнасць гэтых правіл заключалася ў наступным.

Патрабавалася гарантыя ў тым, што той, хто захоча зняць ферму, ёсць асоба благанадзейная і здымае стацыю з мэтай сельскапрамысловаю. Таму ад утрымання ферм адхілены яўрэі і асобы, якія ў час папярэдняга ўтрымання аброчных стацыей аказаліся няспраўнымі, ці неблаганадзейнымі.

Тэрмін арэнднага ўтрымання ферм павялічыўся да 48 год.

Асоба, якая ўзяла ў арэнду ферму, абавязана была па заканчэнню кожных 12 год утрымання павялічыць першапачатковую арэндную плату спачатку на 10, потым на 20 і затым на 30 працэнтаў.

Разам з фермернымі землямі аддаюцца ва ўтрыманне і грамадскія ворывы, а запасныя землі – за вылічаны даход, але з абавязкам здаць іх у казну тады, калі яны спатрэбяцца для надзела сялян.

Фермер надзяляўся свабодай карыстання зямлёй, толькі не меў права яе спусташаць [3, с. 266 – 268].

Першапачаткова здача ферм у арэнду прынесла свае вынікі. Даход ў казну павялічыўся амаль удвая: з люстрацыйнага ў 1 597 ркблёў 54 капейкі да паверачнага 2 414 рублёў 82 капейкі ў Магілёўскай губерні [3, с. 269].

Аднак удзел сялян у таргах на фермы быў амаль немагчымы. Яны не маглі ўнесці неабходны для гэтага заклад і патрабавалі дапусціць іх да таргоў пад "круговое поручительство" сельскіх абшчын. Але II Дэпартамент растлумачыў, што "круговое поручительство" не можа быць прынята замест заклада [3, с. 269].

За лепшыя фермы прапаноўваліся вельмі высокія цэны. Такім чынам амаль усе фермы, якія былі вынесены на таргі былі ўзяты ў арэнду дваранамі, чыноўнікамі і ваеннымі. Сялянам за вялікі кошт аддалі ў арэнду астатнія фермы. Даход у казну ад гэтага быў значны, але ў ахвяру была прынесена сялянская гаспадарка.

Аднак арандатары аказаліся дрэннымі гаспадарамі і паклалі на сялян цяжкі ўціск прыгнячэння. Арэндныя фермы ператварыліся ў ачагі паўпрыгонных прыёмаў гаспадарання і кабалы. Арэндныя фермы з"яўляліся перашкодай для свабоднага развіцця сялянскай фермерскай гаспадаркі.

Пасля перадачы ферм у арэнду важнейшую задачу складала павышэнне аброчных плацяжоў. 12 верасня 1860 г. II Дэпартамент загадаў губернскім палатам тэрмінова прыступіць да састаўлення ведамасцей абкладання сялян "узвышаным аброкам" у 1861 г. [3, с. 239]. II Дэпартамент патрабаваў, каб па гэтых ведамасцях ішлі разлікі ўжо ў першае паўгоддзе 1861 г., не ўлічваючы, што новая нарэзка зямлі яшчэ не была завершана.

Вынікі ўзвышэння аброка былі наступныя: па 9 заходніх губернях (дзе праводзілася контррэформа) аброк у сярэднім павышаны на 22 %, у 6 губернях Літвы і Беларусі – на 23,75 %, у Магілёўскай губерні – на 7,75 % (гэта самая невялікая лічба ў параўнанні з іншымі губернямі). У губернях Літвы і Беларусі (без Ковенскай губерні) ўзвышаны аклад на дзесяціну зямлі ваґаўся ад 75 да 93 капеек, пры гэтым у Магілёўскай губерні гэта быў самы малы паказчык – 75 капеек, а па першай люстрацыі было 58 капеек [2, с. 142].

Пад уздзеяннем абвастрэння класавай барацьбы ў дзяржаўнай вёсцы ўрад вымушаны быў не толькі прыпыніць новыя павышэнні аброку, але фарсіраваць завяршэнне аграрных мерапрыемстваў контррэформы.

У выніку ўсіх мерапрыемстваў праведзеных з 1857 па 1861 гг. сялянскія надзелы былі паменшаны, аброкі былі павялічаны да немагчымага, а менавіта на працягу 1860 – 1861 гг. на 64 %. Але ў 1861 г. была прызнана немагчымасць выплочваць такія сумы і павышэнне аброку было зніжана да 22 % [2, с. 141]. Аднак у адносінах да Магілёўскай губерні патрэбна прызнаць, што ўсе гэтыя змяненні былі меншыя ў параўнанні з астатнімі 8 Заходнімі губернямі, у якіх праводзіліся мерапрыемствы контррэформы.

1 студзеня 1862 г. М. М. Мураўёў пакінуў свой мінстэрскі пост [1, с. 551]. Аднак працэсы контррэформы не спыніліся адначасна, а завяршыліся паступова, а сяляне прынялі ўдзел у паўстанні 1863 – 1864 гг. У гэтыя гады М. М. Мураўёў вымушаны быў прызнаць, што контррэформа пацярпела крах, аднак усклаў адказнасць за гэта на польскі нацыянальна-вызваленчы рух [7, с. 248 – 249]. А ў 1867 г. была праведзена другая паверачная люстрацыя ў заходніх губернях.

**Литература:**

1. Дружинин Н. М. Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселёва.Т. II. – М. 1958.

2. Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности Министерства государственных имуществ 1837 – 1887. – Ч. II. – СПб., 1888.

3. Кавецкий Ст. О люстрацыи и регулировании казенных имений // Журнал Министерства Государственных Имуществ. – 1860. – № 4.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей НГАБ у г. Мінску). Фонд 27: Палата дзяржаўных маёмасцей Мінскай Губерні. Вопіс 5. Справа 489.

5. НГАБ у г. Мінску. Фонд 27. Вопіс 5. Справа 509.

6. НГАБ у г. Мінску. Фонд 2 189: Палата дзяржаўных маёмасцей Магілёўскай губерні. Вопіс 1. Справа 78.

7. Неупокоев В. И. Крестьянский вопрос в Литве во второй трети XIX века. – М.,1976.

8. Сосна У А Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Сялянскае пытанне. // Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік. – Мн., 1996.